

# ДА ВУЧЭННЯЎ ГАТОВЫ. НІЧОГА АД НІКОГА НЕ ЎТОЙВАЕМ

**«Мы ні на каго нападаць не збіраемся»: Прэзідэнт — аб запланаваных ваенных вучэннях з Расіяй**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
17 мая СУБОТА № 94 (30482)




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# СЕЛЕКЦЫЯ ЖЫВОГА «РУБІНУ»

**Як ствараецца ўнікальная парода «чырвоных» кароў**

Яшчэ сто гадоў таму большасць кароў на Беларусі былі рудымі. Яркія, вогненныя «абарыгенкі», якіх разводзілі на беларускай зямлі як мінімум з XVII стагоддзя, — адна з самых старажытных славянскіх парод. Кемлівыя, добразычлівыя і даверлівыя да людзей, гэтыя каровы сапраўды станавіліся для сям'і нечым большым, чым проста буйной рагатай жывёлай. Такую рагулю называлі «карміцелькай», берaглі і любілі.

СТАР. 6–7

ПАПАЎНЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАЛЕНДАРА ПРЫШЧЭПАК 11



КРОСНЫ ДОРАЦЬ СПАКОЙ 12



З НАГОДЫ

# «ШЧАСЛІВЫЯ РАЗАМ»

**Як рэспубліканскі конкурс студэнцкіх сем'яў працуе на ўмацаванне традыцыйных каштоўнасцяў**

Месцам дзеяння VII рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх сем'яў «Шчаслівыя разам» па традыцыі стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій у Магілёве. Менавіта тут сем гадоў таму запусцілі ў жыццё гэтую карысную і прыгожую ініцыятыву. Сімвалічна, што сёлета сем'яў-фіналістаў таксама было сем — з Магілёва, Горак, Брэста, Гродна і Мінска.



СТАР. 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# ДА ВУЧЭННЯЎ ГАТОВЫ. НІЧОГА НЕ ЎТОЙВАЕМ

## «Мы ні на каго нападаць не збіраемся»: Прэзідэнт — аб запланаваных ваенных вучэннях з Расіяй

Учора ў Палацы Незалежнасці прайшла сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з міністрам абароны Расійскай Федэрацыі Андрэем Белавусавым, на якой абмеркавалі правядзенне традыцыйных сумесных вучэнняў «Захад-2025», што маюць адбыцца ў верасні на тэрыторыі дзвюх краін. Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў, што да вучэнняў мы гатовы: «Нічога ад нікога не ўтойваем. Мы сапраўды дэманструем адкрытасць, што гэта вучэнні нашы і носяць абарончы характар. І ні на каго мы нападаць не збіраемся, як некаторыя там думаюць. Але гэта іх справа. Няхай думаюць. У нас прынята рашэнне на ўзроўні прэзідэнтаў па правядзенні вучэнняў».



### «ЦУДОЎНА ПРАЙШОЎ РАЗЛІК»: АБ СВЯТКАВАННІ 80-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ



У пачатку сустрэчы Андрэй Белавусаў перадаў Аляксандру Лукашэнку самыя цёплыя словы ад яго расійскага калегі. «Сутнасць у тым, што ў нас не проста сяброўства, мы ўжо настолькі цесна звязаны, што разумеем адзін аднаго практычна без слоў», — канкрэтызаваў міністр абароны Расіі.

Ён выказаў удзячнасць беларускаму лідару за ўдзел у святкаванні 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў Маскве, за ўдзел у парадзе.

**«Цудоўна прайшоў ваш разлік, — канстатаваў Андрэй Белавусаў. — Вы самі бачылі, і вы былі першым з кіраўнікоў дзяржаў, які ўстаў і прывітаў свой разлік. Сапраўды, хлопцы цудоўна прайшлі».**




### «ГЭТА НАЙВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ»

У верасні на тэрыторыі дзвюх краін пройдуць сумесныя вучэнні «Захад-2025». Аб гэтым ішла размова і ў Палацы Незалежнасці.

**«Да вучэнняў мы гатовы, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Нічога ад нікога не хаваем. Мы сапраўды дэманструем адкрытасць, што гэта вучэнні нашы і носяць абарончы характар.**

І ні на каго мы нападаць не збіраемся, як некаторыя там думаюць. Але гэта іх справа. Няхай думаюць. У нас прынята рашэнне на ўзроўні прэзідэнтаў па правядзенні вучэнняў. З Уладзімірам Уладзіміравічам (Пуціным, Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі. — **«Зв».**) мы абмяркоўвалі гэта пытанне. Што датычыцца нашай часткі, палігонаў Беларусі, мы гатовы. Мы гатовы да таго, калі трэба, вылецець па плане на палігоны Расіі. Наадварот — прыняць расійскія войскі. І правесці сумеснае вучэнне нашай сумеснай групоўкі, якая створана ў Саюзнай дзяржаве».

У гэтым плане, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, Расія можа не турбавацца.

**«Мы вельмі прыстойна падрыхтуемся, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. — Наша беларуская частка, як і на парадзе, не будзе глядзецца горш за іншыя элементы. У тым ліку мы будзем дзейнічаць у зададзеным ключы і будзем адпавядаць тым перадавым метадам вядзення сённяшняй вайны, супраціўлення з улікам (вопыту. — «Зв».) СВА, новых прынцыпаў і метадаў».**

Адной з тэм размовы стала навучанне беларускіх ваеннаслужачых расійскімі спецыялістамі. За гэта Прэзідэнт выказаў удзячнасць расійскаму боку. «Яны нароўні з расіянамі (не лічацца замежнікамі) за адной партай сядзяць і ўсяму, чаму вы навучаеце расійскіх ваеннаслужачых, навучаюцца і нашы, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта вельмі важна, мы гэта вельмі цэнім, бо гэта найвышэйшы ўзровень даверу. Усё-такі гэта бяспека, абарона, і тут Расія не агароджвае сябе ад Беларусі. Такога

# АД НІКОГА

ўзаемадзеяння ў Расіі ні з кім няма. Мы гэта вельмі цэнім».

Абмяркоўваючы пытанне ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць Расійскай Федэрацыі за тое, што яны знайшлі ў гэты няпросты час магчымасць пастаўкі ў Беларусь закупленых намі ўзораў узбраення. «Я маю на ўвазе самалёты, верталёты і гэтак далей, — канкрэтызаваў Прэзідэнт.

**— Мы вельмі актыўна працуем над перспектыўнымі відамі ўзбраенняў. Мы з вамі (ведаеце гэта добра, наша міністэрства падключылася) рэалізуем задуму, якую мы абмяркоўвалі з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным па размяшчэнні тут самых передавых відаў зброі для абароны, у тым ліку «Арэшнік» і гэтак далей. Мы тут значна прасунуліся».**

Рэзюмуючы, беларускі лідар акцэнтаваў увагу на тым, што ўсе павінны разумець: ніхто не жартуе. «Мы ні на каго нападаць не збіраемся, але калі... мы вымушаны абараняць не толькі сваю гістарычную праўду, а і сваю зямлю, сваіх родных, блізкіх, сем'і свае і нашу Айчыну, — падкрэсліў ён. — Таму ў гэтым вы можаце быць упэўнены».

## АД НАВУЧАННЯ ДА ВАЕННА-ТЭХНІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Кіраўнік абароннага ведамства Расійскай Федэрацыі адзначыў, што Расія і Беларусь не проста саюзнікі. «У нас агульная абаронная прастора, якую мы ўмацоўваем, а ў сілу вельмі складанай міжнароднай абстаноўкі абавязаны ўмацоўваць як мага хутчэй, — канстатаваў ён. — Мы гэта ажыццяўляем па трох асноўных кірунках. Гэта павышэнне зладжвання нашых войск, работы штабоў.



Тут, напэўна, ключавая падзея сёлета — нашы сумесныя вучэнні «Захад-2025», якія пройдуць адначасова на палігонах у Расіі і ў Беларусі».

Другім кірункам узаемадзеяння ў абароннай сферы, па словах Андрэя Белавусава, з'яўляецца навучанне ваеннаслужачых Беларусі ў вышэйшых навучальных установах Расійскай Федэрацыі. «У нас цяпер адначасова навучаецца больш як 300 чалавек, — канкрэтызаваў ён. — Мы актыўна перадаём і плануем далей перадаваць вопыт самых сучасных форм вядзення баявых дзеянняў з улікам досведу спецыяльнай ваеннай аперацыі, уключаючы выкарыстанне беспілотных сістэм, што цяпер становіцца асабліва актуальным».

Трэці кірунак — ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. «Мы з Віктарам Генадзьевічам (Хрэніным, міністрам абароны Беларусі. — **«Зв».**) сёння яшчэ запланавалі дэталёва абмеркаваць, прайсці па ўсім парадку дня, а ён у нас вельмі шырокі. Толькі ў нас 15 пытанняў, — удакладніў міністр абароны Расіі. — У Віктара Генадзьевіча яшчэ больш будзе, але яны перасякаюцца, безумоўна. Мы абавязкова ўсё гэта абмяркуем».

У якасці памятнага сувеніра кіраўнік абароннага ведамства Расійскай Федэрацыі перадаў Аляксандру Лукашэнку набор усіх узнагарод Савецкага Саюза, якія ўручаліся за баявыя заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падарунак уяўляе сабой пано, на якім змацаваны копіі савецкіх узнагарод, выкананыя ў натуральную велічыню.

«Андрэй Рэмавіч, я так разумею, вы мяне ўзнагародзіце сёння адразу ўсімі ўзнагародамі», — пажартаваў у адказ на падарунак Аляксандр Лукашэнка.

«Абавязкова», — сказаў міністр абароны Расіі.

«Дзякуй. Гэта мы размесцім на бачным месцы. Вельмі добрая задума: зрабілі ўсе ўзнагароды», — адзначыў Прэзідэнт.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

**У тэму**

## Ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва — краевугольны камень узаемадзеяння Беларусі і Расіі

Аб гэтым заявіў міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін на сустрэчы з міністрам абароны Расіі Андрэем Белавусавым.

Кіраўнік беларускага ваеннага ведамства па выніках перагавораў з расійскім калегам адзначыў, што погляды на забеспячэнне бяспекі Саюзнай дзяржавы цалкам супадаюць у Беларусі і Расіі.

«Сустрэча з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь прадэманстравала, што кіраўнік беларускай дзяржавы трымае на кантролі ўсе аспекты нашых адносін, а ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва з'яўляецца краевугольным каменем міждзяржаўнага ўзаемадзеяння», — сказаў Віктар Хрэнін.

Кіраўнік ваеннага ведамства звярнуў увагу, што былі ўзгоднены далейшыя крокі па падтрыманні і ўмацаванні абароннага патэнцыялу, неабходнага для прадухілення пагрозы ваеннай бяспекі і адбіцця агрэсіі ў выпадку яе развязвання.

«Прадметная сумесная работа ў гэтым кірунку будзе прадоўжана. Усе дасягнутыя дамоўленасці, у тым ліку па рэалізацыі Дагавора аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы, выкананы ў поўным аб'ёме. Мы стаялі і далей будзем стаяць плячо ў плячо на варце бяспекі нашых краін і народаў і будзем прымаць усе неабходныя меры рэагавання ў выпадку любых замахаў на Рэспубліку Беларусь і Расійскую Федэрацыю», — запэўніў Віктар Хрэнін.

**Паводле БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АДЗІНСТВА МАРАЛЬНАСЦІ, ДУХОЎНАСЦІ І ДЗЯРЖАВЫ

## Ігар Сергяенка правёў семінар Палаты прадстаўнікоў у Свята-Успенскім Жыровіцкім манастыры

Тэма мерапрыемства — «Дзяржава і Царква. На варце традыцый і маральных каштоўнасцяў беларускага грамадства». Акрамя таго, удзельнікі семінара азнаёміліся з ходам рэстаўрацыйных работ і ўсклалі кветкі да магілы мітрапаліта Філарэта.

Як адзначыў Ігар Сергяенка, мэта семінара — яшчэ раз абмеркаваць пытанні, якія датычацца аспектаў узаемадзеяння дзяржавы і Царквы, захавання і развіцця духоўнасці. Была падкрэслена важнасць прывіцця моладзі каштоўнасцяў, якія характэрны для беларускага грамадства: павага да старэйшых, гуманізм, добрапрыстойнасць.

*— Сёння робяцца спробы расхістаць нашы асновы, прывіць розныя нетрадыцыйныя каштоўнасці. Царква і дзяржава праводзяць скаардынаваную палітыку, у рамках якой на пастаяннай аснове праходзяць розныя мерапрыемствы. Месца правядзення семінара не выпадковае. Жыровіцы — гэта цэнтр беларускага праваслаўя, сапраўдная жамчужына Беларусі. Зараджэнне храмавага комплексу звязана са з'яўленнем цудатворнага Жыровіцкага абраза Маці Божай. На наступным тыдні праваслаўныя вернікі будуць святкаваць 555-годдзе з'яўлення цудатворнага абраза. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы з 2021 года праводзіцца маштабная рэстаўрацыя Жыровіцкага манастыра. На дадзены момант яна фактычна завяршаецца,* — сказаў Ігар Сергяенка.

Парламентарый падкрэсліў, што ў краіне моцная прававая база, якая дае магчымасць свабодна развівацца ўсім канфесіям. Кожнаму чалавеку гарантавана права на свабоду сумлення і веравызнання. У ліпені мінулага года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», якая дае дадатковыя магчымасці, у тым ліку і Царкве.

Духоўны складнік вельмі важны для грамадства і дзяржавы, для кожнага асобна ўзятага чалавека, адзначыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін. Таму так важна ўмацоўваць і аб'ядноўваць намаганні дзяржавы і Царквы.

*— Царква прысутнічае ў розных сферах. Гэта і культура, і адукацыя, і інфармацыйнае асяроддзе, і маладзёжная палітыка. Царква імкнецца зрабіць як мага больш па розных кірунках, але значна большага выніку можна дасягнуць, калі мы аб'ядноўваем намаганні, працуем разам. Тую духоўную спадчыну, якую нам перадало папярэдняе пакаленне, важна развіваць.*



Рэстаўрацыйныя работы ў манастыры пачаліся ў 1996 годзе пасля візіту Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Спачатку ў будынку Мінскай духоўнай семінарыі, а затым і па ўсёй тэрыторыі святыні. З тых часоў, нягледзячы на тое, што для манастырскага жыцця ўласцівы ўстойлівасць, павольнасць, поўная глыбокай пашаны стабільнасць, святыня пакрысе змяняецца, бо свет не стаіць на месцы. Тысячы вернікаў наведваюць манастыр, і святары жадаюць зрабіць іх знаходжанне камфортным.

Клопат дзяржавы аб духоўным складніку жыцця беларускага народа выразна адчуваецца. Відаць, як беражліва захоўваецца духоўная спадчына. А Царква ў сваю чаргу прытрымліваецца запытаў сучаснага грамадства, захоўвае старое і добрае, абнаўляе яго ў меру неабходнасці і магчымасцяў, каб усё спадарожнічала да дабра сучасных людзей, рэзюмавау ўладыка.

Аб духоўнай сіле Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра гаварыў і старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый Караеў:

*— На працягу стагоддзяў добрыя светлыя думкі сыходзіліся ў адной кропцы, напаўняючы манастыр светлай, станоўчай энергетыкай, якая так выразна адчуваецца. У гэтым святым месцы сплятаюцца духоўнае багацце гісторыі і культурная спадчына. Сюды з'язджаюцца тысячы паломнікаў, каб адчуць святыню, убачыць на ўласныя вочы манастыр, які існуе ўжо больш за пяць стагоддзяў, і ўдыхнуць паветра той асаблівай атмасферы, якая напаўняе гэтае блаславёнае месца. Жыровіцкая ікона Божай Маці звыш пяці з паловай стагоддзяў асвятляе шлях вернікам. Уявіце, колькі пакаленняў звярталіся да яе з маленнямі, з верай і надзеяй, захоўваючы тым самым нітку сувязі з духоўнай спадчынай продкаў.*

Семінар прайшоў плённа, быў закрануты шэраг важных і актуальных тэм. Удзельнікі абмяркоўвалі духоўна-маральныя каштоўнасці як аснову паступальнага развіцця беларускага грамадства, пагаварылі аб захаванні міжканфесіянальнага міру, ролі культуры ў выкананні гэтых задач. Акрамя таго, ішла размова аб духоўных арыенцірах у фарміраванні інфармацыйнай прасторы. Не менш важным стала абмеркаванне перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі і Беларускай праваслаўнай царквы ў справе выхавання юных грамадзян.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
*аг. Жыровіцы Слонімскага раёна.*
**Фота БелТА.**

АКЦЭНТЫ

# АСНОВА ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

## У Мінску прайшла міжнародная міжпартыйная канферэнцыя, дзе абмяркоўвалася ідэалогія адзінства

**Прадстаўнічы форум у рамках святкавання 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне арганізавала партыя «Белая Русь». У рабоце міжнароднай міжпартыйнай канферэнцыі «Ідэалогія адзінства як аснова Вялікай Перамогі: вопыт мінулага і імператывы сучаснасці» ўзялі ўдзел члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, беларуская навуковая, экспертная і медыясупольнасць, дэлегацыі вядучых вышэйшых навучальных устаноў краіны, прадстаўнікі рэлігійных канфесій, дыпламатычны корпус у Рэспубліцы Беларусь, партыйныя дэлегацыі шэрагу дружалюбных краін.**

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну займае асаблівае месца ў нашым жыцці, адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** ў прывітанні ўдзельнікам, арганізатарам і гасцям канферэнцыі. «Мы аддаём даніну павагі тым, хто змагаўся за нашу будучыню, і ўмацоўваем агульнае імкненне жыць у міры і згодзе. Перамога, заваяваная неверагоднымі намаганнямі, мужнасцю і самаадданасцю савецких грамадзян, стала магчымай не толькі дзякуючы ваеннай стратэгіі, але і глыбокаму ўсведамленню агульнага абавязку перад Радзімай. І мы разумеем: ідэалогія адзінства не была выпадковасцю. Яна — у аснове ўзаемападтрымкі і патрыятызму. Калі вораг бясчынстваваў на нашай зямлі, спальваў тысячы вёсак, знішчаў мільёны людзей, не ўзнікала пытанне — а ці змагацца? Адказ быў відавочны: што б там ні было, трэба абараняць сваю сям'ю, Айчыну і будучыню, — адзначыла Наталля Качанава. — Мы маем права і абавязаны адкрыта абмяркоўваць нашу гісторыю, дзяліцца яе ўрокамі з моладдзю і разумець гераізм тых, дзякуючы каму мы вось ужо 80 гадоў жывём у міры».

Перамога над нацысцкай Германіяй — яскравы прыклад яднання і духоўнай згуртаванасці савецкага народа, заявіў у сваім прывітанні **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА.** «Захаванне памяці і гістарычнай праўды аб выніках самай кровапралітнай у гісторыі чалавецтва вайны з'яўляецца важным фактарам недапушчэння будучых войн і захавання міру на зямлі, — перакананы Ігар Сергяенка. — Праўда аб эпахальнай барацьбе з нацызмам абумовіла сутнасць сучаснай ідэалогіі беларускай дзяржавы. Вялікая Перамога стала пачаткам новага этапу развіцця беларускай


Фота БелТА.

культуры і дзяржаўнасці. Злачынствам супраць савецкага народа, іншых народаў свету няма і не можа быць апраўдання і прабачэння. Наш голас — гэта адзінае гучанне загінулых і тых, хто выжыў, продкаў і нашчадкаў. Выкрыццё хлусні, асэнсаванне фактаў, распаўсюджванне і растлумачэнне палітычна значнай інфармацыі, а таксама патрыятычная праектная дзейнасць — галоўная задача партыйнай, навуковай і медыясупольнасці».

Менавіта ідэалогія адзінства адыграла вырашальную ролю ў дасягненні Вялікай Перамогі, заявіў **Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** у прывітанні ўдзельнікам канферэнцыі. «Аб'яднанне розных пластоў грамадства, народаў вакол агульнай мэты дазволіла пераадолець цяжкасці вайны і атрымаць перамогу над фашызмам. Гэты вопыт застаецца актуальным і сёння, калі ўдзел інстытутаў грамадзянскай супольнасці, грамадзян, усяго насельніцтва краіны ў забеспячэнні нацыянальнай бяспекі з'яўляецца залогам стабільнасці, міру і працвітання Беларусі, — перакананы Дзяржсакратар. — Неабходна захоўваць згуртаванасць і салідарнасць ва ўмовах сучасных выклікаў і пагроз дзеля эфектыўнага ім супрацьдзеяння, каб не дапусціць узнікнення новых і эскалацыі наяўных узброеных канфліктаў і войн».

Як паведаміў **старшыня партыі і грамадскага аб'яднання «Белая Русь», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег РАМАНАЎ,** у канферэнцыі ўзялі ўдзел больш за 16 замежных дэлегацый: «Геаграфія вельмі шырокая: Паўднёва-Усходняя Азія, Лацінская Амерыка, Куба, Венесуэла. Акрамя таго, у канферэнцыі бяруць удзел еўрапейскія краіны. І, канешне, нашы стратэгічныя партнёры і сябры. Гэта Расія і Кітай».

Па выніках канферэнцыі прынята рэзалюцыя. Як падкрэсліў Алег Раманаў, у гэты дакумент «закладзены ідэі роўнасці суверэнных праваў народаў, шматпалярнасці, справядлівасці ў міжнародных адносінах, захавання гістарычнай памяці і недапушчальнасці яе перапісвання, тым больш паклёпу на слаўную гісторыю беларускага і іншых народаў, якія змагаліся з нацызмам і цяпер змагаюцца з неанацызмам».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

З НАГОДЫ

# УЗНАГАРОД ШМАТ НЕ БЫВАЕ

## Ад дзіцячых школ да рэспубліканскіх цэнтраў — дзе куюцца перамогі

**Нішто так не аб'ядноўвае людзей, як спорт. Пра любоў беларусаў да спорту і здаровага ладу жыцця шмат казаць не трэба — гэта агульнавядомы факт.**

Але ж у спорце заўсёды ёсць чэмпіёны. Своеасаблівых чэмпіёнаў галіны днямі ўшанавалі ў Міністэрстве спорту і турызму. Святочнае мерапрыемства было прымеркавана да Дня работнікаў фізічнай культуры і спорту, які ў нашай краіне адзначаецца ў трэцюю суботу мая.

### ГАЛЕРЭЯ СПАРТЫЎНЫХ ГЕРОЯЎ

Ва ўрачыстай абстаноўцы ў профільным міністэрстве была адкрыта абноўленая Дошка гонару. Цэлы год на ёй будуць прадстаўлены партрэты герояў Алімпійскіх гульняў 2024 года — двухразовага (адзінага ў свеце) алімпійскага чэмпіёна па скачках на батуце Івана Літвіновіча, сярэбранага прызёра ў гэтым жа відзе спорту Віялеты Бардзілоўскай. Кампанію ім складуць сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Парыжы на веславанні акадэмічным Яўген Залаты і бронзавы прызёр Алімпіяды па цяжкай атлетыцы Яўген Ціханцоў. Таксама на Дошку гонару Міністэрства спорту і турызму занесена прызёр чэмпіянату свету па сінхронным плаванні Васіліна Хандошка.

### МЕДАЛІ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

Поспехі спартсменаў былі б немагчымымі без працы спартыўных функцыянераў і арганізацый. Найлепшыя з іх таксама адзначаны на міністэрскай Дошцы гонару. Галоўнае ўпраўленне спорту і турызму Мінаблвыканкама — ужо трэці раз. І ёсць за што. Летась у складзе нацыянальных і зборных каманд спартсмены Міншчыны заваявалі 68 медалёў на міжнародных спаборніцтвах. **Начальнік упраўлення Яўген БУЛОЙЧЫК** расказаў, што Мінская вобласць — першая з усіх рэгіёнаў постсавецкіх краін — мае ў кожным раённым цэнтры фізкультурна-аздараўленчыя комплексы. «Мінская вобласць трэці год запар занесена на Дошку гонару. Гэта не латарэя, гэта вынік зладжанай работы ўсіх галін, нашых калег з сістэмы адукацыі і аховы



здароўя. І я хачу падзякаваць усёй спартыўнай грамадскасці Мінскай вобласці. Магу смела заявіць, што спартыўная галіна — ужо візітная картка нашага рэгіёна», — адзначыў Яўген Булойчык. Дарэчы, на Дошцы гонару прадстаўлены і спартыўныя аб'екты з Мінскай вобласці — Плешчаніцкае вучылішча алімпійскага рэзерву і ФАЦ «Адзінства» Дзяржынскага раёна.

Як адзначыў **начальнік упраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Сяргей НОВІКАЎ,** галоўная мэта спартыўнай галіны ў рэгіёне — падрыхтоўка рэзерву. Сёлета лідарамі ў дасягненні гэтай мэты былі прызнаны Магілёўская гарадская спартыўная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву і Касцюковіцкі ФАЦ «Фізкультура і здароўе». У Магілёўскай вобласці на Дошцы гонару — самае вялікае прадстаўніцтва. Адзначана таксама і Магілёўскае вучылішча алімпійскага рэзерву. З яго сцен выйшаў алімпійскі чэмпіён па веславанні на каноэ 1992 года Аляксандр Масяйкоў, а ў якасці дырэктара РЦАП па вяслярных відах спорту ён атрымаў пасведчанне аб занясенні на Дошку гонару сваёй установы.

На Дошцы гонару адзначаны таксама РЦАП па гімнастычных відах спорту, Брэсцкі абласны комплексны цэнтр алімпійскага рэзерву, інфармацыйна-турысцкі цэнтр «Мінск», «Чыжоўка-Арэна», ФК «Дынама-Брэст», Мінская Цэнтральная СДЮШАР прафсаюзаў «Спартак» і іншыя спартыўныя ўстановы.

«У нас велізарная колькасць спартыўных аб'ектаў, у галіне працуе 44 тысячы чалавек. Таму вельмі няпроста выбіраць найлепшых. Мы разумеем, што за кожным высокім вынікам, за кожным дасягненнем стаіць праца нашых людзей. І вельмі важна ім падзякаваць за яе. Асабліва тым, хто працуе ў рэгіёнах: ад іх напрамую залежаць спартыўныя дасягненні ўсёй краіны. Тым больш што ўзнагарод шмат не бывае», — звярнуў увагу **першы намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр ДАРАХОВІЧ.**

### У КОЖНАГА ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАЙМАЦЦА СПОРТАМ

Першы намеснік міністра заўважыў, што, нягледзячы на складанасці з допускам нашых спартсменаў на міжнародныя старты, галіна паказвае станоўчую дынаміку. «У кожнага беларуса ёсць магчымасць займацца фізічнай культурай і спортам: за мінулы год у краіне ўведзена 28 новых спартыўных аб'ектаў, адрамантавана больш чым 100 аб'ектаў. Усе яны адкрыты як для прафесіяналаў, так і для аматараў усіх узростаў. Мы не стаім на месцы, сочым за ўсімі трэндамі і ўтрымліваем нашу інфраструктуру ў належным стане для таго, каб можна было паўнавартасна трэніравацца. Дзяржава ўдзяляе вялікую ўвагу і накіроўвае немалыя сродкі для таго, каб нашы грамадзяне мелі магчымасць займацца фізічнай культурай і спортам. У мінулым годзе, паводле даных статыстыкі, 27,9 % насельніцтва былі ўцягнутыя ў пастаянныя заняткі фізічнай культурай і спортам. Мы працуем, каб і далей гэтая колькасць павялічвалася», — адзначыў ён.

Галоўнай жа задачай, па словах Аляксандра Дараховіча, застаецца спорт найвышэйшых дасягненняў, заваяванне медалёў для краіны. Цяпер усе думкі і памкненні аб зімовых Алімпійскіх гульнях 2026 года. Часу засталося вельмі мала. Пакуль да кваліфікацыі на галоўныя старты чатырохгоддзя дапушчаны 13 беларускіх спартсменаў па трох відах спорту: па шорт-трэку, па фігурным катанні, па канькабежным спорце. Такое рашэнне днямі прыняў Міжнародны саюз канькабежцаў. Міжнародны саюз біятланістаў і Міжнародная федэрацыя лыжнага спорту пакуль даць адказ аб допуску беларускіх спартсменаў «не гатовыя». Але самі беларусы заўжды гатовы сумленна спаборнічаць і заваёўваць медалі для краіны. Яны гэта ўжо неаднойчы даказвалі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Міністэрства спорту і турызму**

# ВУП РАСЦЕ

**За 4 месяцы 2025-га яго аб'ём у супастаўных цэнах склаў 102,8 %.**



Як расказалі ў статыстычным ведамстве, ажыццёўлена першая ацэнка валавога ўнутранага прадукту за студзень—красавік гэтага года. Аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў 81,4 мільярда рублёў, або ў супастаўных цэнах 102,8 % да такога ж узроўню мінулага года.

Тут дадалі, што індэкс-дэфлятар ВУП у студзені—красавіку 2025-га ў адносінах да аналагічнага перыяду папярэдняга года склаў 106,6 %.

# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ У ТОПЕ

**За чатыры месяцы бягучага года аб'ём прамысловай вытворчасці ў бягучых цэнах склаў 68,5 мільярда рублёў, або ў супастаўных цэнах 101,4 % да аналагічнага ўзроўню 2024 года.**

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Белстата, растлумачыўшы, што ў разрэзе па відах эканамічнай дзейнасці лідзіруе горназдабыўная прамысловасць (102,8 %); затым ідуць апрацоўчая прамысловасць (101,5 %); забеспячэнне электраэнергіяй, газам, парай, гарачай вадой і кандыцыянаваным паветрам (100,8 %) і водазабеспячэнне; збор, апрацоўка і выдаленне адходаў, дзейнасць па ліквідацыі забруджванняў (100,1 %).

# ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ І МАШТАБНЫЯ ПЛАНЫ

**У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары**

Як падкрэслілі ў адміністрацыі парка, усяго тут зарэгістравана 150 рэзідэнтаў, што сведчыць аб няўхільным росце прывабнасці пляцоўкі для замежных і айчынных інвестараў. Заяўлены агульны аб'ём інвестыцый гэтых рэзідэнтаў дасягае сумы ў 1,57 мільярда долараў. Дадзеныя інвестыцыі, разам з планамі па стварэнні парадку 16 тысяч новых працоўных месцаў, паказваюць на значны патэнцыял парка для стымулявання эканамічнага росту нашай краіны і стварэння высокатэхналагічных працоўных месцаў.




На сёння ўжо 54 рэзідэнты прыступілі да рэалізацыі сваіх праектаў, зрабіўшы адчувальны ўнёсак у беларускую эканоміку. Сёлета парк папоўніўся дзевяццю новымі рэзідэнтамі з Расіі, КНР, Швейцарыі, Турцыі і Беларусі. У цэлым рэзідэнты парка прадстаўляюць 15 краін свету. Гэта геаграфічная разнастайнасць падкрэслівае міжнародны характар праекта і яго прывабнасць для інвестараў з розных краін.

— Разнастайнасць галін, прадстаўленых у «Вялікім камені», таксама з'яўляецца адным з ключавых фактараў яго поспеху, — падкрэслілі ў парку.

Дарэчы, тут пачалі фарміраванне 4 кластары: у сферы машынабудавання — 31 праект, электронікі і тэлекамунікацый — 15 праектаў, біятэхналогій, фармацэўтыкі і медыцынскай прадукцыі — 23 праекты, а таксама комплекснай лагістыкі — 15 праектаў.

— Далейшая дзейнасць парка таксама будзе накіравана на прыцягненне новых інвестараў, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця рэзідэнтаў і пастаяннае ўдасканаленне і развіццё інфраструктуры, — запэўнілі ў адміністрацыі «Вялікага каменя».

# ПАКУПКІ Ў РАДАСЦЬ

**Рознічны тавараабарот у студзені—красавіку 2025-га перавысіў 30 мільярдаў рублёў.**



У прыватнасці, ён склаў 31 мільярд рублёў, або 110 % у супастаўных цэнах да аналагічнага ўзроўню 2024 года.

Па даных статыстычнага ведамства, аднадзённы рознічны тавараабарот у разліку на душу насельніцтва з пачатку года склаў 28,3 рубля супраць 24,1 рубля за аналагічны перыяд 2024-га.

Рознічны тавараабарот арганізацый гандлю, на якія прыйшлося 95,6 % рознічнага тавараабароту краіны, у студзені—красавіку 2025-га склаў 29,7 мільярда рублёў, або 110,8 % у супастаўных цэнах да адпаведнага перыяду папярэдняга года.

Аптовы тавараабарот за гэты перыяд склаў 58 мільярдаў рублёў, або 96,6 % у супастаўных цэнах да ўзроўню студзеня—красавіка 2024 года.

Што датычыцца тавараабароту грамадскага харчавання, то за чатыры месяцы гэтага года ён дасягнуў планкі ў 2,1 мільярда рублёў, або 104,8 % у супастаўных цэнах да аналагічнага ўзроўню мінулага года.

# РУХ — ГЭТА ЖЫЦЦЁ




**Узровень пасажыраабароту ў Беларусі павялічыўся.**

За 4 месяцы бягучага года пасажыраабарот склаў 8 мільярдаў 91,9 мільёна пасажыра-кіламетраў, або 107,2 % да адпаведнага перыяду 2024-га, адзначылі ў Белстаце.

Паслугамі пасажырскага транспарту скарысталіся 559 мільёнаў чалавек, або 101,5 % да студзеня—красавіка 2024-га.

Што датычыцца грузаабароту, то сёлета за чатыры месяцы ён склаў 23,2 мільярда тона-кіламетраў, або 97 % да адпаведнага перыяду 2024 года.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 | |
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблресурсы». 212040, г. Могилев, ул. Залуцкого, 23. УНП 700010221 | |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004. **www.ipmtorgi.by** | |
| **Предмет электронных торгов – транспортные средства (б/у), по адресу: г. Могилев, ул. Залуцкого, д. 23** | | |
| № лота | Марка, модель, рег. знак, год выпуска | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
| 1 | **Автомобиль грузовой платформа тентовая MAZ 437041-262**, рег. знак ТВ4580, 2007 г. в. | 22 920,00 |
| 2 | **Полуприцеп бортовой MAZ 975800-2012**, рег. знак А6672 А-6, 2010 г. в. | 14 160,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 17.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.06.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**

**Магазин «Слуцкий край» 361,5 кв. м** (здание специализированное розничной торговли, инв. № 642/С-11416, составные части: цокольный этаж).
Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Партизанская, д. 1Б.**
***Сведения о земельном участке*: пл. 0,0422 га,** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 08.11.2041) для размещения объектов розничной торговли. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: природные территории, подлежащие спец. охране (в водоохранных зонах рек и водоемов, санитарной охраны водного объекта)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 261 600,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи. По лоту предусмотрено предоставление рассрочки платежа сроком до 2 месяцев с момента заключения договора купли-продажи при первоначальном взносе в день подписания договора в размере не менее 50% от цены продажи с учетом внесенного задатка

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by).
Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие принимаются по 19.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (29) 154-34-35; auction@cpo.by**

**ООО «Фрондера»**
**извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «СИ-трейдинг-Строй»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2072 | Грузовой специальный самосвал MAZ-5551A2, 2008 г. в., рег. № АЕ 3249-5 | 15648,00 | 1564,80 | 782,40 |
| 2073 | Грузовой специальный автокран КАМАZ 43253 KS-3577-3K, 2007 г. в., рег. № АР 0766-5 | 23232,00 | 2323,20 | 1161,60 |
| 2074 | Грузовой бортовой тентовый MAZ-4381P2-422-000, 2014 г. в., рег. № АО 0547-5 | 48096,00 | 4809,60 | 2404,80 |
| 2075 | Грузовой вагон VOLKSWAGEN CRAFTER, 2014 г. в., рег. № АО 5392-5 | 35040,00 | 3504,00 | 1752,00 |
| В отношении лотов проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 25.04.2025 | | | | |
| **Местонахождение:** Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Николая Михайлашева, 1Б | | | | |

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **2 июня 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 19 мая 2025 года до 16.00 29 мая 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй», проводимых 02.06.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375 (29) 3082897, +375 (29) 3058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (44) 504-42-77, Игорь (пн – пт с 10.00 до 17.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Строительное унитарное предприятие «СИ-трейдинг-Строй» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (17) 3958917 (220081, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, 7А/1-36, офис № 803, УНП 691526626)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Утерянный страховой полис обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь в количестве 1 шт. серии ТА № 3044321, выданный в представительстве Белгосстраха по Молодечненскому району **считать недействительным.**
УНП 100122726

# СЕЛЕКЦЫЯ ЖЫВОГА «РУБІНУ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пазбаўленае сантыментаў XX стагоддзе адправіла «на сметнік гісторыі» многія «лакальныя» пароды сельскагаспадарчай жывёлы. Малочная вытворчасць большасці краін зрабіла стаўку на буйныя комплексы, дзе ад жывёл патрабаваліся іншыя якасці. Таму чорна-белыя галштыны — жывыя вінцікі тэхналагічнага ланцужка — сёння парода малочнай жывёлы, што пераважае ў свеце.



У другой палове мінулага стагоддзя ўрадам БССР было прынята рашэнне аб развіцці ў рэспубліцы чорна-пярэстай пароды, расказвае **доктар сельскагаспадарчых навук, намеснік генеральнага дырэктара НПЦ па жывёлагадоўлі Уладзімір ЦІМАШЭНКА.**

— У Беларусі на той момант актыўна разводзіліся, акрамя «чырвонай», і іншыя пароды БРЖ — швіцкая, кастрамская, сіментальская. Але ўсе яны саступалі чорна-пярэстай па канверсіі корму ў прадукцыю (то-бок, затрачвалі на літр малака больш кармоў), — тлумачыць навуковец. — А таму былі заменены спачатку больш «інтэнсіўнай» чорна-пярэстай пародай, і ўжо ў нашы дні — беларускай галштынскай. Яна ідэальная для буйных малочнатаварных комплексаў па форме і памерах вымя, хуткасці малакааддачы і, як я ўжо казаў, канверсіі корму.

Сёння, калі практычна ў любой краме Беларусі на паліцах дзясяткі відаў высакаякаснай малочнай прадукцыі, актуальным становіцца (і гэта агульнасусветная тэндэнцыя) пытанне стварэння нацыянальных фуд-брэндаў — унікальных прадуктаў па ўласных аўтэнтычных рэцэптах, з асаблівай, мясцовай сыравіны. Менавіта крафтавасць і эксклюзіўнасць у сучасным свеце вызначаюць прэміяльны сегмент харчовай прадукцыі, што па праве становіцца сімвалам краіны-вытворцы. І таму было прынята рашэнне аб адраджэнні чырвонай беларускай пароды. На момант пачатку работы генетыкаў і селекцыянераў зусім невялікі статак — усяго 300 галоў вогненна-рудых «аўтэнтычных» кароў — захаваўся толькі ў гаспадарцы «Новы двор» у Свіслацкім раёне. Такім чынам, амбіцыйны праект па адраджэнні, а дакладней, практычна па стварэнні новай унікальнай пароды распачаўся літаральна з нуля. Сёння каля 1200 галоў «чырвонай» жывёлы ўтрымліваецца ў РВУП «Вусце» — эксперыментальнай гаспадарцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ёсць «чырвоны» статак у РУП «Шыпяны-АСК» і, вядома, ва УСП «Новы двор», які здолеў захаваць унікальны генафонд. Племяннное ядро пароды засяроджана ў ГП «ЖодзінаАграПлемЭліта» Смалявіцкага раёна. І больш за 300 «арыстакратак» храбусціць кормам на селекцыйна-племяннной ферме «Будагова», куды мы і накіраваліся, каб пагладзіць «сонечных» цялятак і даведацца пра незвычайныя ўласцівасці малака ад спрадвечных беларускіх кароў.

## АД СЛОВА «ПЕСЦІЦЬ»

Каровы не ўкусяць, не паспрабуюць бáднуць, але могуць аблізаць, папярэджваюць гасцей на СПФ «Будагова». Першае, што здзіўляе на гэтай, здавалася б, звычайнай ферме — прыхільнасць жывёл да чалавека. Цяляты некалькіх дзён ад нараджэння, убачыўшы незнаёмцаў, тут жа выбіраюцца са сваіх «хатак»: што смачнага ты ім прынёс? А грацыёзныя, нібы казулі, цёлкі («чырвоная беларуская» адрозніваецца ад звыклых сучасным беларусам чорна-пярэстых кароў па тыпе целаскладу) падыходзяць да загародкі і, штурхаючы адна адну, патрабуюць, каб іх пагладзілі і пачасалі за вушкам. Ды і велізарныя «матулі», на здзіўленне, дабрадушныя.

Бадацца кароўкам няма чым: рогі ліквідуюць яшчэ ў пачатку іх росту, у першую чаргу для бяспекі саміх жывёл. Але і жадання такога жывёлы не праяўляюць. Селекцыя вядзецца па многіх кірунках — якасць малака, прадукцыйнасць, устойлівасць жывёл да мастыту, агульны імунітэт, экстэр'ер (знешні выгляд), расказвае **загадчык лабараторыі распрацоўкі інтэнсіўных тэхналогій па вытворчасці малака і ялавічыны Андрэй МУЗЫКА.** А вось давер да чалавека ў чырвонай пароды спецыяльна не культываваўся — ён дастаўся рагулям на генетычным узроўні «ад прашчураў». Як і кемлівасць, — не меншая, чым у сабак.

— Яны хітрыя, — усміхаецца **брыгадзір СПФ «Будагова» Святлана ГРУЗДЗЕВА.**

Калі работнікі фермы раздаюць смачныя дадаткі, некаторыя каровы могуць атрымаць двайную порцыю: адабраць у суседкі або выпрасіць у чалавека. Нядзіўна, што ў такіх, асабліва разумных, ёсць імёны.

— Вось гэта, напрыклад, Песта, — знаёміць суразмоўніца.

Песта — ад слова «песціць», імя атрымала за ласкавы нораў.

І яшчэ адно назіранне: на СПФ «Будагова» нават у пахмурны дзень неяк светла і радасна — з-за «сонечнага» колеру статка. Такі «кантактны заапарк» міжволі прымушае задумацца аб утылітарных адносінах сучаснага чалавека да сельскагаспадарчых жывёл у процівагу адносінам да іх у даіндустрыяльную эпоху. У «Будагове» добразычлівасць «чырвоных» кароў тлумачаць не толькі генетыкай. Статак невялікі, і ўтрыманне кароў нагадвае фермерскае (беспрывязное, з выгульнымі надворкамі і пастаянным кантактам з чалавекам), а «выбыццё» жывёл адбываецца толькі з прычыны хваробы. Сярэдні тэрмін прадукцыйнасці галштынаў на буйных малочнатаварных комплексах — усяго тры лактацыі. Тут жа надоі не зніжаюцца і ў чацвёртую, і ў пятую лактацыю. Раней даілі робаты, расказаў Андрэй Музыка. Але чалавечыя рукі — дабрэйшыя, яны больш арганічныя для здароўя жывёл.

Афіцыйна парода яшчэ не створана. Але ўжо сёння дасягненнямі ў гэтай галіне актыўна цікавяцца фермеры. Некалькі дзясяткаў элітных «чырвоных» кароў знайшлі сабе новы дом у фермерскіх гаспадарках у розных кутках краіны.

## ТРЭНДАВЫ ПРАДУКТ

**— Так, галштыны па прадукцыйнасці выйграюць — іх паказчык 15 тысяч тон малака за год. У нас сярэдні надой ад каровы крыху перавышае**





**8 тысяч тон, але трэба ўлічваць яшчэ і пералік на базісную тлустасць. «Базіс» складае 3,6 % тлушчу, малако ж ад «чырвоных» кароў у «Будагове» — тлустасцю 4,6 %. Такім чынам, калі пералічыць на «базу», надоі ў нас атрымліваюцца ў раёне «дзяcяткі», — кажа Андрэй Музыка.**




Гэты паказчык тлустасці, дарэчы, не нашмат меншы, чым у знакамітай пароды Джэрсі, тлустасць малака якой на ўзроўні 5 % і больш.

— Але «джэрсейкі» вельмі патрабавальныя да догляду, а нашы «чырвоныя» каровы якраз не патрабавальныя, у іх моцны імунітэт, — тлумачыць спецыяліст.



Галоўная каштоўнасць пароды — якасць малака, падкрэслівае суразмоўнік. Тлустасць у сярэднім на 30 % вышэйшая, чым у галштынскай пароды (ад 4 да 5,5 % пры сярэднім паказчыку ў галштынаў 3,6-3,7 %), утрыманне бялку на ўзроўні 3,6-4,5 % (у малацэ чорна-пярэстай пароды яго звычайна да 3,2 %). Высокабялковасць — сучасны трэнд малочнай прамысловасці: у свеце расце цікавасць да прадуктаў з высокім утрыманнем бялку. І яшчэ адзін немалаважны плюс — нізкае ўтрыманне саматычных клетак у малацэ «чырвоных» кароў дзякуючы генетычнай устойлівасці пароды да мастыту. Андрэй Музыка дадае, што 100 % малака «Будагова» здае гатункам «экстра».

— А яшчэ гэта малако вельмі смачнае, — рэзюмуе эксперт. — Хоць, вядома, гэта мая суб'ектыўная ацэнка.

Тлустасць і высокае ўтрыманне бялку робяць малако «чырвоных» кароў аптымальнай сыравінай для вытворчасці элітных сыроў. Ды і для звыклых для большасці спажыўцоў «народных» відаў сыру, тварагу і іншай малочкі гэта сыравіна — ідэальная. 3 тоны такога малака ў сярэднім выхад сыру вышэй на 7,9 кг, а тварагу — амаль на 17,5 кг.

І яшчэ адна «фішка» чырвоных беларускіх кароў — у гэтай папуляцыі малако А2 сустракаецца ў жывёл нашмат часцей, чым у галштынаў, кажа Андрэй Музыка. Лёгкая засваяльнасць і нізкая алергеннасць такога малака абумоўлены яго бялковым складам: адсутнасцю ўтрымання β-казеіну тыпу А1. Малако А2 сёння — яшчэ адзін з сусветных трэндаў здаровага харчавання.

## АСАБЛІВА КАШТОЎНЫЯ

Работы па стварэнні пароды плануецца завяршыць да 2030 года, расказаў Уладзімір Цімашэнка. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць у кожным новым пакаленні дакладна прагназаваць прыкметы, якія патрэбныя генетыкам, таму праца ідзе хутчэй, чым яшчэ дзесяцігоддзе таму, калі стварaліся белгалштыны.

— У селекцыйным працэсе прымяняюцца інавацыйныя метады, якія ўключаюць выкарыстанне комплексных селекцыйных індэксаў сумесна з прыёмамі ДНК-маркернага тэсціравання і прагназавання ступені выяўлення прадукцыйных прыкмет у нашчадкаў. Ацэнка з'яўляецца дакладным крытэрыем генетычнай каштоўнасці і ўключае каэфіцыенты эканамічнай значнасці прыкмет, якія селекцыянуюцца, — адзначае навуковец. — Прымяняецца вызначэнне генетычнай каштоўнасці метадам BLUP і маніторынг генафонду па локусах генаў, асацыіраваных з паказчыкамі малочнай прадукцыйнасці.

Дарэчы, «чырвоныя» каровы ў Будагове, відавочна, адчуваюць, што яны — каштоўнасць. І даверліва тыкаюцца носам у рукі людзей, разлічваючы на ласку і прысмакі...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**




**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Несвижский райагросервис»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 18.06.2025 в 10.00.**

**Лот № 1:**
Свеклоуборочный комбайн Holmer Terra Dos 2, заводской № 243208, 2008 г. в.
Начальная цена – 110 160,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 10 000,00 руб.

**Лот № 2:**
Трактор К 701, Заводской № 9103073, 1991 г. в.
Начальная цена – 25 560,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 2 500,00 руб.

**Лот № 3:** LADA 212140, кузов (рама) № XTA212140H2287388, 2017 г. в.
Начальная цена – 12 720,00 с учетом НДС 20 %.
Задаток – 1 200,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–3:**
Минская область, Несвижский район, деревня Рудавка, ул. Ленинская, 162.

Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется
на р/с BY85BAPB30127802900100000000
в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **16.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(Организатор аукциона)
по поручению филиала **«Автобусный парк № 2» ОАО «Миноблавтотранс»** (Продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже

**АДМИНИСТРАТИВНОГО КОРПУСА,**
**инв. № 640/С-61959, общей площадью 1 447,8 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,3485 га, с кадастровым номером 624650100001008353**
(право постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 1.**

**Условия продажи:**

1. Улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества.
2. Поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели).
3. Обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости.
4. Разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством.
5. Проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2-х лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета.
6. Использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.
7. Запрет на увеличение существующей санитарно-защитной зоны ввиду расположенной рядом индивидуальной жилой застройки.
8. Запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 50,40 бел. руб.**
***Цена равна 1 (одной) базовой величине.***
**Задаток – 50,40 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 26.04.2018, 10.10.2018, 15.10.2019, 27.06.2020, 01.12.2020, 18.10.2022, 06.10.2023, 03.09.2024.*

Аукцион состоится **02.06.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.05.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516 80 65, 516-80-64; 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (01795) 45 0 85; 8 (029) 326 16 25.**

УНН 601070249

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 21** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 7 х 5 м.
Площадь: 38,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1939 год постройки.
Материал стен: деревянный.
Этажность: одноэтажный.
На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.
Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.
Одноквартирный жилой дом разрушен.
Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Булойчик Владимир Алексеевич (умер 07.04.2009 г.), Булойчик Валерий Алексеевич (умер 24.04.2012 г.).
Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 15 лет.
От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.
Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 8 (017) 15 62 3 32, 8 (017) 15 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 21**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 21 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Булойчик Владимир Алексеевич (умер 07.04.2009 г.), Булойчик Валерий Алексеевич (умер 24.04.2012 г.).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 (017) 15 62332, 8 (017) 15 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).**

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 20** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6 х 10 м.
Площадь: 60,7 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1937 год постройки.
Материал стен: деревянный.
Этажность: одноэтажный.
На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.
Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.
Одноквартирный жилой дом разрушен.
Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей):собственник Соболь Вера Николаевна (умерла 22.07.2008 г.).
Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 15 лет.
От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.
Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 8 (017) 15 62 3 32, 8 (017) 15 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 20**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 21 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Соболь Вера Николаевна, умерла 22.07.2008 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 (017) 15 62332, 8 (017) 15 62333** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462


# «ШЧАСЛІВЫЯ РАЗАМ»

## ДВА Ў АДНЫМ

На гэтым тыдні напярэдадні Міжнароднага дня сям'і ў Магілёве адначасова з конкурсам «Шчаслівыя разам» стартаваў яшчэ адзін рэспубліканскі праект — «Гісторыя маёй сям'і». Яго ініцыятарам стаў Рэспубліканскі маладзёжны цэнтр «Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы» і Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет пры Міністэрстве адукацыі.

— Імпануе, што ў конкурсе «Шчаслівыя разам» ёсць сугучны нашаму праекту момант — складанне генеалагічнага дрэва сям'і, — адзначыла **начальнік Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра Юлія ЗІНКЕВІЧ.** — Ідэя конкурсу «Гісторыя маёй сям'і» — расказаць пра свой род, продкаў. Мы правядзём яго ў кожным універсітэце, а потым агучым на ўсю краіну самыя цікавыя гісторыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Дарэчы, для ўдзельнікаў конкурсу «Шчаслівыя разам» стварэнне радаводу стала першым іспытам у праграме. Сужэнцы прыехалі з ужо гатовымі работамі.

## НА ЎЗРОЎНІ МІНІСТЭРСТВА

У тым, што конкурс «Шчаслівыя разам» стаў традыцыйным, заслуга Міністэрства адукацыі, лічыць **рэктар Беларускага дзяржуніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій Максім КІРКОР.** Ён упэўнены: гэта мерапрыемства вельмі карыснае для маладых сем'яў.

— Радуе, што ўніверсітэт ставае для канкурсантаў па-сапраўднаму дамашнія ўмовы, — заўважыла **начальнік упраўлення па справах моладзі галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ.** — Гэтыя сем'і ўзніклі ў самыя шчаслівыя моманты іх студэнцкага існавання. Хацелася б, каб цёплыя адносіны захаваліся на ўсё жыццё і толькі мацнелі. Сям'я — ячэйка грамадства. Любая дзяржава моцная толькі тады, калі ў яе моцныя сем'і.

## ВЫПРАБАВАННІ НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Прапаганда традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, падтрымка студэнцкіх сем'яў, стварэнне станоўчага іміджу маладой сям'і, вывучэнне гісторыі сям'і, прывіццё моладзі высокіх маральных якасцяў і навыкаў сацыяльнай актыўнасці — усё гэта асноўныя мэты конкурсу «Шчаслівыя разам». Тры дні ўдзельнікі жылі ў дынамічным спартыўным рытме. Родныя, сябры, знаёмыя падтрымлівалі іх і афлайн, і анлайн. З самага старту была дадзена магчымасць прагаласаваць за ўпадабаных удзельнікаў у месенджары. І тая маладая сям'я, якая сабрала большую колькасць галасоў, таксама атрымала прыз.

На працягу сямі гадоў канкурсантаў па-мацярынску апякуе **прарэктар універсітэта Вольга МАЦЫКАВА.**

— Мы заўсёды імкнёмся ствараць для ўдзельнікаў сяброўскую ўтульную атмасферу, — кажа яна. — Абавязкова ўлічваем іх пажаданні, гатовы карэктаваць пад іх праграму.

Заданні конкурсу падабраныя такім чынам, каб згуртаваць сем'і, праверыць іх на трываласць. Напрыклад, юнакам трэба было самастойна, без удзелу жонак, закупіць за паўгадзіны прадукты на 30 рублёў. А дзяўчатам прыгатаваць святочную вячэру з гэтых прадуктаў на прасунутай універсітэцкай кухні. Яшчэ тое выпрабаванне! Бо гэта не проста кухня, а спецыяльная вучэбная лабараторыя, дзе да міжнародных турніраў рыхтуюцца найбольш адораныя кухары з ліку студэнтаў. Некаторыя ўдзельніцы ўпершыню мелі справу з тым перадавым абсталяваннем, якое там устаноўлена. Не менш складанай была задача адказаць на пытанні магілёўскіх студэнтаў на ток-шоу «Мы — сям'я і мы шчаслівыя». Вось дзе спатрэбіліся вынаходлівасць і дасведчанасць. Пары выпрабоўваліся таксама творчым паядынкам «Умелыя рукі», праяўлялі фантазію ў вырабе ключніцы, дэманстравалі свае артыстычныя таленты на тэму «Ты помніш, як усё пачыналася». Было шмат эмоцый, гумару, хвалявання. Упершыню ўдзельнікам прапанавалі медыцынскую квэст-гульню на базе дзіцячай паліклінікі. Нехта справіўся лепш, нехта — горш, але карысны вопыт атрымаў кожны. У маладых сем'яў на працягу трох дзён конкурсу была магчымасць не толькі спаборнічаць, але і прыемна адпачыць, пазнаёміцца са шматвяковай гісторыяй горада на Дняпры, наведаць знакавыя культурныя аб'екты і месцы гераічнай славы. Адным словам, не сумавалі.







## САКРЭТ СЯМЕЙНАГА ШЧАСЦЯ АД ВЕТЭРАНАЎ...

Уладзімір Львовіч і Вольга Дзмітрыеўна Малышавы — сужэнцы з 53-гадовым стажам — пажаніліся, калі вучыліся у гэтай жа ВНУ. Пасля вучобы засталіся працаваць выкладчыкамі. Апошнія тры гады яны нязменныя члены конкурснага журы.

— Нягледзячы на меркаванне, што раннія шлюбы не трывалыя, мы — сведчанне таму, што яно памылковае, — сцвярджаюць сужэнцы. — У нас агульныя сябры і ўспаміны, няма нічога такога, пра што мы не ведалі б адно пра аднаго. Мы разам болей чым паўстагоддзя і нам не надакучыла. Шлюбы, у аснове якіх ляжыць не толькі моцнае каханне, але і сяброўства, — самыя трывалыя. Трэба, каб былі агульныя і цяжкасці, і перамогі. Некаторыя жадаюць усяго і адразу. А на наш погляд, самае каштоўнае — калі ўсё здабываецца разам.

## ...І АД УДЗЕЛЬНІКАЎ

Яна і Максім Цюніс, студэнты 4 курса Беларускага дзяржуніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, разам ужо год. Яна родам з Гродна, Максім — з вёскі Стараселле Шклоўскага раёна. Дзяўчына пажартавала, што шлях да сэрца Максіма пачаўся праз страўнік.

— Яшчэ абітурыенткамі мы з сяброўкай звярнулі ўвагу на двух маладых хлопцаў, — усміхаецца суразмоўніца. — Запрасілі на бульбу, яны спачатку адмовіліся, а потым прыйшлі. З таго моманту мы з Максімам і сябруем.

Летась сужэнцы ўдзельнічалі ў конкурсе маладых сем'яў СНД у Маскве і занялі там другое месца. Кажуць, што для сямейнага шчасця трэба ўмець чуць адно аднаго, а калі пасварыліся, як мага хутчэй ісці на міравую. У сям'і без кампрамісу нельга.

Калі вярстаўся нумар, стала вядома, што Гран-пры рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх сем'яў «Шчаслівыя разам» застаецца ў Магілёве. Найлепшай студэнцкай парай 2025 года стала сям'я Яны і Максіма Цюніс. Віншуем пераможцаў! Усе астатнія сем'і таксама атрымалі шчодрыя падарункі. Бо, як зноў гучала падчас фінальнага этапу, тых, хто прайграў, у гэтым конкурсе не бывае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіваў удзельнікаў.**

З НАГОДЫ

# ПАМЯЦЬ СЯМ'І — ПАМЯЦЬ НАРОДА

## Як гродзенцы захоўваюць гісторыю продкаў, якія набліжалі Перамогу

Вялікая Айчынная вайна — гэта не толькі трагічная частка нашай і сусветнай гісторыі. Гэта боль кожнай асобна ўзятай сям'і. Мільёны загінулі, прапалі без вестак. Але гісторыі герояў беражліва захоўваюцца ў сем'ях. Напярэдадні Дня сям'і ўласны карэспандэнт «Звязды» далучыўся да праекта ГрДУ імя Янкі Купалы, каб даведацца, як гродзенцы захоўваюць памяць продкаў.

«Сямейная хроніка купалаўцаў» — кранальны праект, дзе супрацоўнікі і студэнты расказваюць пра сваіх родных, якіх закранула вайна. Выкладчыца Таццяна Кантаровіч падкрэсліла важнасць моцнай сямейнай сувязі і захавання гістарычнай памяці. Яе родныя з усіх сіл набліжалі Дзень Перамогі. А нашчадкі беражліва захоўваюць памяць пра гэты подзвіг і нясуць яе з пакалення ў пакаленне. Таццяна тлумачыць дзецям, наколькі важна жыць ва ўзаемаразуменні, памятаць страшныя ўрокі гісторыі для таго, каб вайна ніколі не ступіла на нашу зямлю зноў. Таццяна з трапятаннем расказвае пра лёсы сваіх родных:

*— Брат маёй бабулі Сяргей Максімавіч Доўгі нарадзіўся ў 1921 годзе. У чэрвені 1941-га скончыў ваеннае вучылішча і напісаў бацькам ліст, што яго адпраўляюць на фронт. Гэта была апошняя вестачка, якую атрымалі родныя. У першыя тыдні вайны Сяргей загінуў на фронце і значыцца зніклым без вестак. Але яго нашчадкі ведаюць, што ён аддаў жыццё за Перамогу. Дзядуля па бацькоўскай лініі Філіп Фёдаравіч Кантаровіч нарадзіўся ў 1915 годзе. Пайшоў на вайну ў якасці радавога, быў адпраўлены на фронт і дайшоў да Берліна, узнагароджаны медалём «За адвагу». Дзядуля па матчынай лініі Пётр Маркавіч Сарока нарадзіўся ў 1917 годзе. Пасля заканчэння Тамбоўскага ваеннага вучылішча быў адпраўлены на фронт на пасадзе тэхніка. Пад Кіевам яго часць трапіла ў акружэнне, і яму з аднапалчанамі прыйшлося прабірацца лясамі і балотамі, каб сысці ад ворага. Праз месяц, у лістападзе 1941-га арганізаваў партызанскі атрад і працягнуў барацьбу. Бабуля таксама ваявала за Перамогу. Антаніна Максімаўна Сарока сустрэла вайну 18-гадовай дзяўчынай. Яна вырашыла стаць партызанскай сувязной. Дастаўляла ў атрад аператыўную інфармацыю аб месцазнаходжанні варожых войскаў, іх перамяшчэнні і руху. У 1943-м пра гэта стала вядома немцам. Яны схапілі дзяўчыну, і яна чакала смяротнага прысуду. Але цудам удалося выратавацца. Яна і далей дапамагала параненым.*

Ганна Карпінчык, супрацоўніца ўніверсітэта, з гонарам расказала гісторыю свайго прадзеда. Яна адзначыла, што абсалютна ўсе члены сям'і ведаюць пра подзвіг продкаў і будуць перадаваць гісторыю далей. Гэта частка традыцый сям'і Карпінчык.

*— Мой прадзядуля — герой Вялікай Айчыннай вайны — Сцяпан Піліпавіч Карпінчык. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Славы III ступені. Прадзядуля служыў у 6-й стралковай роце 577-га стралковага палка імя Ракасоўскага. Удзельнічаў у аперацыі «Баграціён» і ў вызваленні мноства гарадоў у Польшчы і Германіі. Сцяпан Піліпавіч — прыклад для ўсёй нашай сям'і. Мы шануем памяць усяго роду і памяць нашага прадзеда. Ён мала гаварыў пра вайну, зусім крыху расказваў сваім дзецям і ўнукам. Усю гісторыю яго жыцця расказаў мой бацька Мікалай Карпінчык. А я раскажу сваім будучым дзецям. Хацелася б нагадаць усім, што гісторыі сем'яў беларусаў — гэта памяць не толькі блізкіх, але і ўсяго народа. Мой прадзядуля быў шмат разоў паранены, але змог вярнуцца дадому з Перамогай, якая падарыла нам усім жыццё.*



**Вольга ВАСКЕВІЧ разам з дачкой Каралінай склалі альбом «Кніга памяці маёй сям'і» — пра подзвіг прадзеда Пятра Яхоўскага.**



**Сцяпан і Марыя Карпінчыкі. Вясельнае фота. 1930-я гады.**

Супрацоўніца Вольга Васкевіч расказала пра свайго прадзеда, які браў удзел у вызваленні Еўропы. Разам з дачкой Каралінай яны склалі альбом «Кніга памяці маёй сям'і» пра подзвіг іх роднага чалавека.

*— Нарадзіўся прадзядуля Пётр Янавіч Яхоўскі ў 1903 годзе. У сям'і выхоўвалася пяць дзяцей. У 1944-м пасля вызвалення Шчучынскага раёна ад нямецка-фашысцкай акупацыі ва ўзросце 41 года ён быў адпраўлены ад Шчучынскага РВК у 1-ю Варшаўскую польскую пяхотную дывізію ў званні радавога. Удзельнічаў у фарсіраванні ракі Вісла, у вулічных баях за Прагу. У студзені 1945 года полк Пятра Янавіча ўдзельнічаў у вызваленні Варшавы. З 9 лютага 1945-га працягваў рухацца наперад па Заходнім Памор'і. З 13 лютага 1945-га і да канца месяца першы пяхотны полк змагаўся на Паморскім вале за маёнтак Мазанава. Менавіта тут 17 лютага 1945 года абарваўся баявы шлях майго прадзеда. У нашай сям'і захоўваецца пахаванка, у якой паведамляецца аб яго гібелі.*

І гэта толькі малая частка гісторый сем'яў супрацоўнікаў і студэнтаў ГрДУ імя Янкі Купалы, якіх закранула вайна. Любоў родных дапамагае захаваць памяць пра тых, хто ваяваў дзеля будучыні. І выказаць падзяку.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота з сямейных архіваў герояў.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | Гражданин Республики Беларусь | | |
| **Предмет публичных торгов (электронного аукциона)** | | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
| 1 | Здание двухэтажное, общ. пл. 275,10 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Ленина, д. 8 | 113 000,00 | 64 350,00 |
| **Задаток –** 10 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»** | | | |
| **Шаг электронного аукцион** – 5 % от начальной цены лота | | | |
| Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи – 3 (три) рабочих дня** после электронного аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета электронного аукциона – 5 (пять) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи. **Переход права собственности** – после полной оплаты имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним | | | |
| **Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by | | | |
| Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 2 % от конечной цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона) | | | |
| Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона) | | | |
| **Дата и время проведения торгов (аукциона):** 16.06.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 17.05.2025 по 13.06.2025 г. до 15.00. Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 12** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

Сведения о жилом доме (из акта):
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 8 х 10 м.
Площадь: 45,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1945 год постройки.
Материал стен: деревянный.
Этажность: одноэтажный.
На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.
Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.
Одноквартирный жилой дом находится в аварийном состоянии.
Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник Кудин Федор Васильевич (умер 10.01.1998 г.).
Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.
От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.
Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 8 (017) 15 62 3 32, 8 (017) 15 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 12**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Васильевка, ул. Сиреневая, д. 12 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Кудин Федор Васильевич (умер 10.01.1998 г.).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 (017) 15 62332, 8 (017) 15 62333** (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 20 %

**Организатор аукциона:**
ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.
**Продавец:** ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2, УНП 400076540

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.06.2025 с 11.00 до 12.00**

**Грузовой седельный тягач MAZ 54323,**
рег. № ЕА 5351, (инв. № 150-5732), год выпуска – не определен, кузов (рама) № б/н, цвет – серый, пробег – 931 096 км, состояние – удовлетворительное (б/у).

**Полуприцеп фургон тентовый MAZ 9758 030,**
рег. № 3809ЕВ, (инв. № 150-5291), год выпуска – 2002, кузов (рама) № Y3M97580020004855, цвет – голубой, состояние – хорошее (б/у).
Местонахождение: г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Начальная цена с учетом НДС 20 % – 35 040,00 бел. руб.**
Задаток **10 % от начальной цены** перечисляется на р/с BY10 AKBB 3012 0310 1009 6000 0000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, УНП 400076540, получатель платежа – ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин.
Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 03.12.2024 г.
Детальная информация об электронных торгах, в том числе о порядке их проведения, оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП **www.torgiservis.by**.

**Контактные данные (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17; 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 400076540



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1: трактор «Беларус-82.1», год выпуска 2003 г., регистрационный знак АА 6186, заводской номер 08082906** | | | |
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 10 600,00 | **Размер задатка, руб.** | 1 060,00 |

**Местоположение:** Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Кривляны, ул. Ленина, 5. **Продавец:** ОАО «Матеевичи», 225101, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Кривляны, ул. Ленина, 5-1, пом. 1, тел. 80164141307. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее, чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 июня 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 июня 2025 г. до 17.00**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «ААА Солюшенс», УНП 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, ком. 38** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 1042 | Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс» (с полным списком дебиторов, можно ознакомиться на торговой площадке: www.torgi24.by) | **14 898 306,16** |

**Расположен по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS301208936000 10000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников)

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – **не более 9 000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 03.06.2025 в 11.00.**
**Дата и время окончания торгов: 03.06.2025 в 16.00**

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке **www.torgi24.by.** Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by.** Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 17.05.2025 по 30.05.2025,** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by**


ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

# ГРЭЦЦА, КАБ НЕ ЗГАРЭЦЬ

## Павялічваецца колькасць пажараў, на якіх гінуць людзі

На нетыповы для гэтай пары ўсплёск пажараў у жылым фондзе, безумоўна, паўплывала зусім не майскае надвор'е. Людзі працягваюць паліць у печы, каб сагрэцца, выкарыстоўваюць электраабагравальнікі. Пры гэтым грэбуюць элементарнымі правіламі бяспекі і эксплуатацыі электрычных прыбораў. Не абыходзіцца і без аматараў шкодных звычак, якія, будучы, як правіла, у нецвярозым стане, кураць у хаце, — менавіта такая катэгорыя ў асноўным і папаўняе трагічную статыстыку.

### ЦЫГАРЭТА-ЗАБОЙЦА



Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ,** на пагаршэнне сітуацыі паўплывала халоднае надвор'е: «Людзі пачынаюць грэцца, што павышае рызыку ўзнікнення пажараў. Грамадзянам трэба быць больш уважлівымі да гэтай праблемы. Пры выкарыстанні печаў і цеплагенерыруючых прылад, электраабсталявання выконваць правілы бяспекі, эксплуатацыі. Катэгарычна забараняецца курыць у памяшканні, асабліва ў стане алкагольнага ап'янення».

На пажары ў ноч на 13 мая ў Баранавічах загінулі тры чалавекі. Трагедыя адбылася ў прыватным сектары. Па прыбыцці на месца здарэння ратавальнікі вынеслі з хаты гаспадыню і яе дачку, якія знаходзіліся ў беспрытомным стане. Пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў медыкі канстатавалі смерць жанчын. Таксама супрацоўнікі МНС знайшлі ў хаце загінулага мужчыну. Па папярэдняй версіі, да няшчаснага выпадку магло прывесці неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

Мяркуецца, што менавіта па гэтай прычыне ўспыхнуў пажар і ў Маладзечанскім раёне. У дадзеным выпадку, на шчасце, абышлося без ахвяр. Падраздзяленні МНС, якія прыбылі да месца выкліку, выявілі дым з акна кватэры на другім паверсе. На балконе знаходзіўся чалавек. Пры дапамозе ратавальнага капюшона супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях вывелі сына гаспадыні кватэры 1990 года нараджэння. Да прыбыцця ратавальнікаў сусед пацярпелых выратаваў з палаючай кватэры яго маці. Жанчыну шпіталізавалі. У выніку пажару агнём знішчана маёмасць у пакоі, закураны сцены і рэчы па ўсёй плошчы кватэры.

Дзякуючы пільнасці суседзяў быў выратаваны мужчына і на пажары ў Чэрвеньскім раёне. Не чакаючы прыезду пажарнай службы, суседзі кінуліся на дапамогу. Калі прыехалі ратавальнікі, дом ужо быў ахоплены полымем.

Толькі ў Мінскай вобласці з пачатку года ад гэтай згубнай звычкі, якая прывяла да ўзгарання, загінулі 32 чалавекі. У прыватнасці, трагічны выпадак у пачатку красавіка здарыўся ў Слуцкім раёне. У доме, дзе адбыўся пажар, пражываў беспрацоўны грамадзянін. Яго жонка таксама нідзе не працавала. Абое загінулі на пажары: іх моцна абгарэлыя целы ратавальнікі дасталі з-пад завалаў. Па папярэдняй версіі, да трагедыі прывяло неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нагадваюць, што курыць варта ў строга адведзеных месцах. Тушыць недакуркі трэба ў попельніцы ці бляшанцы, напоўненай вадой. Катэгарычна забараняецца кідаць непатушаныя цыгарэты з балконаў ці лоджый, на падлогу, у ніжнія пралёты лесвічнай клеткі ці шахту ліфта. І нарэшце, забудзьцеся аб курэнні ў ложку: гэта нічым добрым не заканчваецца.

### СІГНАЛ БЯДЫ

Больш за палову пажараў з гібеллю адбываецца, калі чалавек спіць. Пажар небяспечны найперш высокай тэмпературай і моцным задымленнем. Дым змяшчае вялікі пералік таксічных рэчываў, якія шкодныя і могуць прывесці да смерці на працягу некалькіх хвілін.

Своечасова з прыкметамі атручэння чадным газам ва ўстанову аховы здароўя звярнулася сям'я са Стаўбцоўскага раёна. Як высветлілася, раніцай перад прыездам унукаў з Мінска гаспадыня хаты растапіла ў печы. Вечарам адна з дзяўчынак паскардзілася на дрэннае самаадчуванне — бацькі выклікалі хуткую дапамогу. Усе дзеці былі шпіталізаваны. На наступны дзень іх выпісалі дахаты. Прычынай няшчаснага выпадку стала дачаснае закрыццё засланкі печы.

Своечасова выявіць узгаранне, а, адпаведна, пазбегнуць матэрыяльнай шкоды, траўміравання і гібелі можна і трэба, устанавіўшы ў кватэры ці доме аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Такіх прыкладаў, калі гэта невялікая і танная прылада выратавала жыццё, дастаткова. Днямі аб пажары ў суседняй кватэры мужчына даведаўся менавіта дзякуючы сігналу аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка. На паведамленне аб пажары ў шматкватэрным жылым доме па вуліцы Янкі Купалы ў Брэсце аператыўна выехалі ратавальнікі. Прыбыўшы на месца выкліку, супрацоўнікі МНС у кватэры на другім паверсе пяціпавярховага дома выявілі нязначнае задымленне. Высветлілася, што да прыбыцця ратавальнікаў мужчына, які пражывае на чацвёртым паверсе дома, дапамог пенсіянерцы. Адчуўшы пах дыму ў сваёй кватэры, ён выйшаў у пад'езд, дзе пачуў гук аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка, які даносіўся з кватэры на другім паверсе. Мужчына зайшоў унутр і выратаваў з задымленага пакоя гаспадыню. Самастойна справіўся з узгараннем. Пенсіянерку 1941 года нараджэння шпіталізавалі. Агонь пашкодзіў маёмасць, у пакоі закураны сцены і столь.

### РЫЗЫКА АД ЭЛЕКТРАПРЫБОРАЎ

